© С.Ф. Іванова, Я.Я. Іваноў, В.А. Шпакоўская

ПАРАДЫЙНЫЯ, ІРАНІЧНЫЯ І ЖАРТОЎНЫЯ ТРАНСФАРМАЦЫІ КРЫЛАТЫХ ВЫРАЗАЎ (да складання слоўніка беларускіх антыпрыказак)

Разам з пашыраным ужываннем крылатых слоў без змянення іх сэнсу і знешняй формы вельмі часта яны выкарыстоўваюцца ў маўленні з пэўнымі змяненнямі, у мадыфікаваным выглядзе. Змяненні звычайна не закранаюць змест крылатых слоў, паколькі яго захоўванне з'яўляецца неабходнай умовай функцыянавання крылатых слоў як інтэртэкстаў. У тых жа выпадках, калі трансфармацыя знешняй формы вядзе да змянення сэнсу крылатых слоў, утвараюцца новыя адзінкі, якія або выконваюць намінацыйную функцыю (скіраваны на адлюстраванне нейкай з'явы, падзеі, служаць для наймення нейкіх рэалій ці выражэння пачуццяў і г. д.), або ствараюцца выключна дзеля жарту, іранічнага асэнсавання рэчаіснасці, пародыі на зыходную адзінку, змест яго тэксталай крыніцы ці светапогляд яе аўтара. Такія парадыйныя, іранічныя і жартоўныя трансфармацыі крылатых выразаў адносяцца да жанру т. зв. "антыпрыказак" і досыць распаўсюджаны ў цяперашні час.

У выніку парадыйнага абыгрывання, скажонага цытавання, "асмяяння", "выварочвання" ўстойлівага і прывычнага погляду на свет, жыццё чалавека, адлюстраванага ў прыказках, крылатых словах, літаратурных афарызмах, сфарміраваўся ўжо цэлы пласт спецыфічнага моўнага матэрыялу ў розных нацыянальных культурах свету, які вядомы парэміёлаг В. Мідэр прапанаваў называць "антыпрыказкі" (нем. "Antisprichwörter", англ. "anti-proverbs") ці перакручаныя (скажоныя) мудрасці (нем. "verdrehte Weisheiten", англ. "twisted wisdom") і вывучаць асобна ад іншых устойлівых адзінак (у тым ліку і патэнцыйна). На сённяшні дзень апублікаваны зборнікі антыпрыказак на нямецкай мове [Mieder 1982, 1985, 1989, 1997, 1998, 1999], англійскай мове [Litovkina 1999, 2002], рускай мове [Вальтер 2000, 2001; Walter 2002; Вальтер 2005, 2006; Иванов 2009] і інш.

Фіксацыя і вывучэнне антыпрыказак на матэрыяле беларускай мовы як аднаго з паказчыкаў сучаснага стану яе парэмійнага фонду з'яўляецца адной з актуальных задач беларускай фразеалогіі (парэміялогіі).

Ніжэй прапануецца невялікая падборка антыпрыказак, якія ўтварыліся ў выніку парадыйнай, іранічнай ці жартоўнай трансфармацыі крылатых слоў, што ўжываюцца ў сучаснай беларускай літаратурнай мове. Гэтая падборка – першы крок да ўкладання слоўніка беларускіх антыпрыказак, які рыхтуецца ў Лабараторыі мовазнаўства і лінгвадыдактыкі МДУ імя А.А. Куляшова.

Антыпрыказкі падаюцца пасля тых крылатых слоў, якія з'яўляюцца зыходнымі адзінкамі. Крылатыя словы суправаджаюцца кароткай даведкай аб іх паходжанні. Кожная антыпрыказка пашпартызавана паводле крыніцы яе ўжывання ў сучаснай беларускай літаратурнай мове (гл. Скарачэнні).

Ад родных ніў, ад родный хаты У панскі двор дзеля красы Яны, бяздольныя, узяты Ткаць залатыя паясы... – радкі з верша "Слуцкія ткачыхі" (1912) М. Багдановіча (1891–1971).

• Бяз родных ніў, бяз роднай хаты пішу я толькі кампраматы! Ананім (А 2008–9).

Ай Моська! Мае моц яна, што брэша на слана! < руск. *Ай, Моська! Знать, она сильна, что лает на слона!* – выслоўе з байкі "Слон и моська" (1808) І.А. Крылова (1768–1844).

• Моська. "Як я брахала на слана". Мемуары (В 1998–10).

Апетыт прыходзіць у часе яды < фр. *L'appetit vient en mangeant* – афарызм з рамана "Гарганцюа і Пантагруэль" (1532) Ф. Рабле (1494–1553), у якім ужываецца ў прамым значэнні як цытата трактата "Аб прычынных" (1535) Ж. дэ Анжэ (?–1538).

• Апетыт прыходзіць у гасцях (В 2004–2).

Аўтамабіль – не раскоша, а сродак перамяшчэння < руск. *Автомобиль – не роскошь, а средство передвижения* — афарызм з рамана "Золотой телёнок" (1931) І. Ільфа (І.А. Файзільнберга, 1897–1937) і Я. Пятрова (Я.П. Катаева, 1902–1942).

• Аўтамабіль – не раскоша, але жабраком зрабіць зможа (В 1987–19)

• Доўгія ногі – не раскоша, а сродак руху (В 2001–8).

Беражыце мужчын < руск. *"Берегите мужчин!"* – загаловак артыкула Б.Ц. Урланіса ў газеце «Литературная газета» ад 24 ліпеня 1968 г. пра тое, што мужчыны паміраюць значна раней, чым жанчыны.

• Беражыце мужчын! Не выходзьце замуж! (В 2001–8).

Вароне раз Гасподзь паслаў кавалак сыру < руск. *Вороне как-то Бог послал кусочек сыра...* – першыя радкі байкі «Ворона и лисица» (1807) І.А. Крылова (1769–1844).

• Не лаві варон, якім Бог не паслаў кавалачак сыру (В 2005–6).

Вучыцца, вучыцца і вучыцца < руск. *Учиться, учиться и еще раз учиться* – выслоўе з артыкула «Лучше меньше, да лучше» (1923) У.І. Леніна (Ульянава, 1870–1924), упершыню прагучала ў яго прамове на III з'ездзе Расійскага камуністычнага саюза моладзі ў 1920 г.

· Вучыцца, вучыцца, вучыцца… А калі працаваць? (В 1998–11).

Грошы не пахнуць < лац. *Non olet pecunia* — выслоўе рымскага імператара 69–79 гг. Веспасіяна, пра якое згадваецца ў творы Светонія "Vitae XII imperatorum" (кніга 8 "Vita divi Vespasiani", 23).

· Грошы не пахнуць, а на смак лепш не каштаваць (В 2006–9).

<Добра> смяецца той, хто смяецца апошні (апошнім) < фр. *Rira bien qui rira le dernier* ('Добра будзе смяяцца, той хто смяецца апошнім') – афарызм з байкі "Два селяніна і хмара" (1792) Жана П'ера Клары дэ Фларыяна (1755–1794) < англ. *He laughs best that laughs last* ('Лепей за ўсіх смяецца той, хто смяецца апошнім') – афарызм з п'есы "Сельскі дом" (1703) Джона Ванбру (1664–1726). Першапачаткова французская прыказка.

· Як доўга трэба смяяцца, каб апынуцца апошнім? (В 1990–22).

· Смяецца той, хто кіруе! (В 1995-3).

· Хто смяецца апошнім? Той, да каго пазней даходзіць… (В 2006–3).

Дыпламаваны баран – назва байкі (1926) К. Крапівы (К.К. Атраховіча, 1896–1991).

·Асёл з дыпломам – ужо не асёл, а дыпламаваны баран (В 1990-6).

Жанчынай не нараджаюцца, ёй становяцца < руск. *Женщиной не рождаются, ею становятся* – афарызм з кнігі аб жаночай эмансіпацыі "Другой пол" (1949) С. дэ Бовуар (1908–1986).

·Лысымі і начальнікамі не нараджаюцца – імі з часам становяцца (В 2004–1).

Жылі-былі… < руск. *Жили-были…* – традыцыйны зачын рускіх (таксама беларускіх і ўкраінскіх) народных казак.

· Адны жылі-былі, а іншыя былі, але не дажылі (В 2003–12).

Жыццё – <гэта> барацьба < лац. *Vivere militare est* – афарызм з "Epistolae morales" (96, 5) Сенекі (каля 4 да н. э. – 65 н. э.). Першапачаткова сустракаецца ў трагедыі "Ἱκέτιδες" (550–551) Эўрыпіда (каля 480–407 або 406 да н. э.).

· Жыццё – не толькі барацьба, але і іншыя віды спорту (В 2004–10).

Жыццё даецца <чалавеку толькі> адзін раз <, і пражыць яго трэба так, каб не было сорамна за дарэмна пражытыя гады> < руск. *Самое дорогое у человека — это жизнь. Она дается ему один раз, и прожить ее надо так, чтобы не было мучительно стыдно за бесцельно прожитые годы* — афарызм з рамана "Как закалялась сталь" (1932–1934) М.А. Астроўскага (1904–1936).

· Жыццё даецца чалавеку адзін раз, і то выпадкова (В 2000–2).

Жыць стала лепш, <таварышы,> жыць стала весялей < руск. *Жить стало лучше, товарищи. Жить стало веселее* – словы з прамовы І.В. Сталіна (Джугашвілі, 1879–1953) на І Усесаюзнай нарадзе стаханаўцаў 17 лістапада 1935 г.

· Жыць стала лепш… За мяжой (В 2003–10).

Заплаці падаткі і спі спакойна < руск. *Заплати налоги – и спи спокойно* – выраз з агітацыйнага тэлевізійнага роліка Міністэрства па падатках і зборах Расійскай Федэрацыі.

· Заплаці падаткі – і спі спакойна з кім хочаш (В 2002–1).

· Аддавай усю зарплату жонцы і спі спакойна (В 2007–6).

З каханым (з мілым) рай і ў шалашы < руск. *С милым рай и в шалаше* – афарызм з верша "Руская песня" (1815) Н.М. Ібрагімава (1778–1818) і аднайменнай песні на яго словы (музыка народная).

· З мілым рай і ў шалашы. Галоўнае, што кухні ў ім няма (В 2005–6).

Змагацца і шукаць, знайсці і не здавацца < руск. *Бороться и искать. Найти и не сдаваться* – дэвіз галоўнага героя романа «Два капитана» (1938–1944) В.А. Каверина (Зільбера, 1902–1989). Першапачаткова апошняя фраза паэмы «Уліс» (1842) А. Тэнісана (1809–1892): "To strive, to seek, to find, and not to yield".

· Шукаць, знайсці і не перахаваць… (В 2006–1).

Зязюля пеўня ўсхваляе, Таму што хваліць ён яе < руск. *Кукушка хвалит петуха За то, что хвалит он кукушку* – радкі з байкі «Кукушка и петух» (1834) І.А. Крылова (1769–1844).

· Зязюля хваліць пеўня, а певень топча курыцу (Дз 2005, 6).

Ісціна ў віне < лац. *In vino veritas* – афарызм з "Naturalis historia" (XIV, 28, 22) Плінія Старэйшага (23 або 24–79).

· Ісціна доўга плавала ў віне, пакуль не патанула (В 1985–22).

· Колькі б не шукалі ісціну ў віне, на самой справе яна знаходзіцца ў гарэлцы (В 1996–12).

· Колькі б ні спрачаліся, сутнасць – не ў віне, а ў закусцы (В 1999–11).

Каб ты жыў на адну зарплату! < руск. *Чтоб ты жил на одну зарплату!* – выраз з к/ф «Бриллиантовая рука» (1969) рэжысёра Л.І. Гайдая (1923–1993).

· Каб ты жыў на адну Нобелеўскую прэмію! (Дз 2005–6).

Казёл адпушчэння – выраз са Св. Пісання (Лев., 16, 9, 10).

· Казламі адпушчэння часцей за ўсё бываюць бараны (В 1987–11).

Коннік без галавы < англ. "*The Headless Horseman*" – назва рамана (1866) Т.М. Рыда (1818–1883).

· "З галавой быць добра, а без галавы лепш", – сказаў "Коннік без галавы" (В 1990-22).

Круглы стол < англ. *the round table* – выраз з сярэднявечнага рамана пра легендарнага караля брытаў Артура (V–VI стст.), у якім распавядаецца, што чараўнік Мэрлін аднойчы параіў бацьку Артура стварыць рыцарскі ордэн Круглага Стала, члены якога сядзелі б на пірах за круглым сталом, каб адчуваць сябе роўнымі сярод роўных і не спрачацца аб лепшым ці горшым месцы.

· І за "круглым сталом" можна аказацца крайнім (В 1999–10).

Лепш менш, ды лепш < руск. *"Лучше меньше, да лучше"* – назва артыкула (1923) У.І. Леніна (Ульянава, 1870–1924).

· Лепш больш, але менш (В 2000–1).

Лягчэй вярблюду пралезці праз вугольнае вушка, чым багатаму ўвайсці ў царства Божае — афарызм са Св. Пісання (Мф., 19, 24; Лк., 18, 25).

· Пралез праз вуголінае вушка – можаш не прадстаўляцца (В 1984–2).

· Калі пралез праз вушка іголкі – паспрабуй давесці, что ты не вярблюд (В 2006–6).

Маладым у нас дарога ўсюды <, а старым павага ўсюды ў нас!> < руск. *Молодым везде у нас дорога, Старикам везде у нас почет* – выслоўе з песні "Песня о Родине" (1936) І.В. Дунаеўскага (1900–1955) на словы В.І. Лебедзева-Кумача (1898–1949), якая ўпершыню прагучала ў кінафільме "Цирк" (1936) рэжысёра Р.В. Аляксандрава (1903–1983) па яго сцэнарыю.

· Плакат ля ўвахода ў лабірынт: "Дарогу маладым!" (В 2001–4).

Мафія бессмяротная < руск. *Мафия бессмертна!* – выслоўе з к/ф «Невероятные приключения итальянцев в России» (1974) рэжысёра Э.А. Разанава.

· Мафія бессмяротная. Кашчэй (В 1994–2).

Мой дзядзька самых добрых правіл... < руск. *Мой дядя самых честных правил, Когда не в шутку занемог, Он уважать себя заставил И лучше выдумать не мог* – першыя радкі рамана ў вершах «Евгений Онегин» (1823–1831) А.С. Пушкіна (1799–1837).

· Мой дзядзька – самых чэсных правіл, а ўсё таму, што ён картавіў (і кожнае гучала слова абавязкова памылкова!) (А 2008–9).

Мой родны кут, як ты мне мілы! Забыць цябе не маю сілы – першыя радкі паэмы "Новая зямля" (1919–1923) Я. Коласа (К.М. Міцкевіча, 1882–1956).

· Мой родны кот, як ты мне мілы! (В 1996-2).

· Мой родны кут, як ты мне мілы! Або я тут, або мне вілы! Я. Колас (ARCHE 2008–9).

Мы пойдзем іншым шляхам! < руск. *Мы пойдем другим путем!* – выслоўе У.І. Леніна (Ульянава, 1870–1924), якія той казаў, калі даведаўся аб казні свайго роднага брата Аляксандра за рэвалюцыйную дзейнасць.

• Адны ходзяць пад Богам, другія – пад "мухай". Мы пойдзем іншым шляхам (В 1993–5).

Мядзведжая паслуга < руск. *медвежья услуга* – выраз склаўся на аснове абагульнення зместу байкі "Пустынник и медведь" (1808) І.А. Крылова (1769–1844).

• Мядзведзь: "Акажу паслугу" (В 2001–7).

Народжаны поўзаць лётаць не можа < руск. *Рожденный ползать – летать не может!* – афарызм з верша ў прозе "Песня о соколе" (1895) М. Горкага (А.М. Пешкава, 1868–1936).

• Народжаныя поўзаць нярэдка кіруюць палётамі (В 1988–12).

• Народжаныя поўзаць лятаць не могуць. Затое могуць вельмі высока запаўзаць (В 1991–21).

• Народжаны поўзаць лятаць не можа, затое можа стаць птушкай высокага палёту (В 1994–8).

• Народжаны лётаць поўзаць не можа (В 1999–7).

• Народжаныя лятаць звычайна ездзяць на трамваях (В 2004–2).

Не крадзі – выслоўе са Св. Пісання, адзін з Божых запаветаў.

• Не крадзі ў бліжняга – суседзі ўбачаць (2005–3).

Не хлебам адзіным жыве чалавек – афарызм са Св. Пісання (Лк., 4, 4): "Не аб хлебе адзіным жыў будзе чалавек".

• "Не хлебам адным будзе сыты чалавек", – мовіў повар і дабавіў у катлеты мяса (В 2002–10–11).

Нішто не вечна(-е) пад месяцам < руск. *Ничто не ново под луною* – афарызм з верша "Вопытная Саламонава мудрасць, або Выбраныя думкі Еклесіяста" (1797) М.М. Карамзіна (1766–1826), перайманне афарызма са Св. Пісання (Екл., 1, 9–10): "Што было, тое і будзе; і што адбывалася, тое і будзе адбывацца, і няма нічога новага пад сонцам".

• Думкі з'яўляюцца і знікаюць: нічога няма вечнага (В 1989–4).

Ну, заяц, пачакай! < руск. *Ну, заяц, погоди!* – выраз з мультфільма "Ну, погоди!" (1969–1992) рэжысёра В.М. Кацёначкіна (1927–2000), ролю ваўка ў якім агучваў А.Дз. Папанаў (1922–1987).

• Ну, дыета, пачакай! (надніс на торце) (В 2007-4).

Ня дай Гасподзь мне страціць клёк. Не, лепей торба і кіёк... (пераклад Р. Барадуліна) – радкі з верша "Не дай мне бог сойти с ума" (1833) А.С. Пушкіна (1799–1837).

• Ня дай мне, Божа, страціць розум. Лепш быць галодным і цвярозым! (А 2008–9).

• Ня дай Гасподзь, каб дах мне знесла. Лепш электрычнае ўжо крэсла! (А 2008–9).

· Ня дай мне, Божа, з'ехаць з глузду. Ўжо лепей кій… шары і лузу! (А 2008–9).
· Ня дай Гасподзь шызафрыніі. Лепш сам башкой аб камяні я! (А 2008–9).
· Ня дай мне, Божа, параноі. Лепш клафеліну мне ў спіртное! (А 2008–9).
· Ня дай мне, Божа, у Навінкі. Лепш маладым памру ад свінкі! (А 2008–9).
· Ня дай Гасподзь быць звар'яцелым – Хай галава сябруе з целам (А 2008–9).

Няма (не бывае) правілаў без выключэння < руск. *Правил нет без исключений* – афарызм з рамана ў вершах "Евгений Онегин" (1823–1831) А.С. Пушкіна (1799–1837). Першапачаткова афарызм Сенекі (каля 4 да н. э. – 65 н. э.): *Nulla regula sine exceptione.*

· Кожнае выключэнне мае сваё правіла (В 1990–6).

Пазнай самога сябе < ст. грэч. *Γνῶθι σεαυτόν* – выслоўе Фалеса, аднаго са знакамітых "сямі мудрацоў старажытнасці", якое, паводле падання, было напісана на франтоне храма Апалона ў Дэльфах, пра што згадваецца ў творы Дыягена Лаэрція "De vitis dogmatis et apophthegmatis eorum qui in philosophia claruerunt" (I, 13, 40): "Nosce te ipsum".

· Ведаем мы вас, але не можам пазнаць сябе (В 2004–5).

Пакахайце нас чорненькімі, а беленькімі нас ўсякі пакахае < руск. *Полюби нас черненькими, а беленькими нас всякий полюбит* – выслоўе з паэмы «Мертвые души» (1842, II, 2) М.В. Гогаля (1809–1852).

· Пакахайце мяне чорненькую, а беленькую мяне ўсякі пакахае. Мулатка (В 2003–2).

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся! < ням. *Proletarier aller Länder, vereinigt euch!* – выслоўе з "Маніфеста Камуністычнай партыі" (1848) К. Маркса (1818–1883) і Ф. Энгельса (1820–1895). Пазней лозунг Міжнароднага рабочага руху.

· Жанчыны ўсіх краін, яднайцеся… са сваімі мужамі! (В 1995–2).
· Пралетарыі ўсіх краін, пахмяляйцеся! (Дз 2005–6).

Прыгажосць — <гэта> страшэнная сіла < руск. *Красота – это страшная сила* – афарызм з к/ф «Весна» (1947) рэжысёра Р.В. Аляксандрава (1903–1983).

· Прыгажосць – страшэнная сіла. Баба-Яга (В 2003–2).

Прыйшоў, убачыў, перамог < лац. *Veni, vidi, vici* – выслоўе Гая Юлія Цэзара (102 або 100–44 да н. э.), у якім ён паведаміў у лісце да свайго сябра Амінтыя аб перамозе ў бітве пры Зелі ў жніўні 47 г. да н. э. над панційскім царом Фарнакам, сынам Мітрыдата, пра што згадвае Плутарх у сваім творы "Βίοι Παράλληλοι" (у лацінскім перакладзе "Vitae parallelae").

· Прыйшоў, убачыў, перамог і… пачаў плаціць аліменты (В 2007–2).

Рукапісы не гараць < руск. *Рукописи не горят* – афарызм з рамана "Мастер и Маргарита" (1929–1940) М.А. Булгакава (1891–1940).

• Рукапісы не гараць. А вось ганарары знікаюць бясследна (Дз 2007–5).

Скажы <мне>, хто твае сябры (твой сябра), <і> я скажу, хто ты < ісп. *Dime con quéin andas y te diré quién eres* – афарызм з рамана "Дон-Кіхот" (1605–1615) М. дэ Сервантэса Сааведры (1547–1616).

• Скажы мне, што ты думаеш, і я скажу табе, колькі дзён засталося да тваёй зарплаты (В 2004–6).

У Еўропу прасячы акно < руск. *в Европу прорубить окно* – выраз з паэмы "Медный всадник" (1833) А.С. Пушкіна (1799–1837).

• Пры адчыненым акне ў Еўропу сон здаравейшы (В 2000–10).

Усё цячэ, усё мяняецца (змяняецца) < ст. грэч. *Πάντα ῥεῖ* – афарызм Геракліта Эфескага (каля 520–460 да н. э.).

•Час цячэ, і ўсё не мяняецца (В 1986–22).

Чалавек – <гэта> гучыць горда < руск. *Человек! Это звучит гордо!* – афарызм з п'есы "На дне" (1902) М. Горкага (А.М. Пешкава, 1868–1936).

• Чалавек! – гэта гучыць горда, пакуль не пачынае заплятацца язык (К 38).

Чалавек народжаны для шчасця, як птушка для палёту < руск. *Человек рожден для счастья, как птица для полета* – афарызм з апавядання «Парадокс» (1894) У.Г. Караленкі (1853–1921).

• Усе няшчасці чалавека ад таго, што ён створаны для шчасця (В 1999–10).

Чым больш жанчыну мы кахаем, тым спадабацца ёй лягчэй < руск. *Чем больше женщину мы любим, тем легче нравимся мы ей* – афарызм з рамана ў вершах "Евгений Онегин" (1823–1831, 4, VII) А.С. Пушкіна (1799–1837).

• Чым менш жанчыну мы кахаем – тым болей часу нам для сну (В 2001–7).

Што наша жыццё? – Гульня < руск. *Что наша жизнь? – Игра* – выслоўе з оперы "Пиковая дама" (1890) П.І. Чайкоўскага (1840–1893), лібрэта да якой напісаў М.І. Чайкоўскі (1850–1916) паводле аднайменнай аповесці (1833) А.С. Пушкіна (1799–1837).

• Жыццё – гэта гульня. У дурня (В 1992–9).

Эх, скручу я дудку! Такое зайграю, Што ўсім будзе чутна Ад краю да краю! – радкі з верша "Мая дудка" з кнігі "Дудка беларуская" (1891) Ф. Багушэвіча (1840–1900).

• Эх, скручу я дудку! Такое зайграю… А лепей ня буду. І табе ня раю (А 2008–9).

Далёка не ўсе з прыведзеных антыпрыказак шырока распаўсюджаны ў маўленні, што, дарэчы, увогуле ўласціва антыпрыказкам як маўленчаму жанру,

ужыванне якіх мае яскрава індывідуальна-маўленчы характар. Тыя з іх, што замацуюцца ў маўленні непазбежна страцяць свой парадыйны сэнс (у адносінах да зыходнай адзінкі) за кошт узнікнення сталых парадыгматычных адносін (найчасцей антаніміі або сінаніміі) з адзінкамі парэміялагічнай або фразеалагічнай падсістэм мовы (накшталт прыказак *Праца дурня любіць* або *Праца не воўк, у лес не ўцячэ*, якія першапачаткова, відаць, парадыравалі традыцыйную прыказкавую мудрасць – ухваленне працы як асновы жыцця чалавека ў грамадстве).

Прыведзеныя адзінкі – гэта толькі невялікая частка антыпрыказак, утвораных ад крылатых слоў. Дакладную колькасць такіх антыпрыказак вызначыць немагчыма (з прычыны надзвычайнага дынамізму іх стварэння і знікнення) ды, напэўна, і не трэба. Галоўнае, што яны існуюць, актыўна ствараюцца і сведчаць аб неўміручым гумары і невычэрпнай дасціпнасці беларускага народа.

Скарачэнні

А – "ARCHE"
В – "Вожык"
Д – "Дзеяслоў"
К – Коўзкі М.

Літаратура

Вальтер, Х. Пословицы русского субстандарта (материалы к словарю): экспериментальный выпуск / Х. Вальтер, В.М. Мокиенко. – Грайфсвальд, 2000. – 45 с.

Вальтер, Х. Пословицы русского субстандарта (материалы к словарю): экспериментальный выпуск / Х. Вальтер, В.М. Мокиенко. – 2. verb. u. erw. Aufl. – Greifswald, 2001. – 77 с.

Walter, H. Wörterbuch russischer Anti-Sprichwörter. Lehrmaterial für Studenten der Slawistik / H. Walter, V. Mokienko. – Greifswald, 2002. – 153 s.

Вальтер, Х. Антипословицы русского народа: словарь / Х. Вальтер, В.М. Мокиенко. – СПб.: Нева, 2005. – 573, [1] с.

Вальтер, Х. Прикольный словарь: антипословицы и антиафоризмы / Х. Вальтер, В.М. Мокиенко. – СПб.: Нева, 2006. – 384 с.

Иванов, Е.Е. Антипословицы Рунета: типология и словарь / Е.Е. Иванов; ред. С.А. Важник. – Минск: Право и экономика, 2009. — 72 с.

Litovkina, *A.T.* Twisted Wisdom: Modern Anti-Proverbs / A.T. Litovkina, W. Mieder. – Burlington: The University of Vermont, 1999. – 256 s.

Litovkina, A.T. Twisted Wisdom: Modern Anti-Proverbs / A.T. Litovkina, W. Mieder. – Burlington: The University of Vermont, 2002. – 260 s.

Mieder, W Antisprichwörter: Band I: Verlag für deutsche Sprache / W. Mieder. – Wiesbaden: Quelle & Meyer, 1982. – 235 s.

Mieder, W. Antisprichwörter: Band II: Verlag für deutsche Sprache / W. Mieder. – Wiesbaden: Quelle & Meyer, 1985. – 222 s.

Mieder, W. Antisprichwörter: Band III / W. Mieder. – Wiesbaden: Quelle & Meyer, 1989. – 195 s.

Mieder, W. Verkehrte Worte: Antizitate aus Literatur und Medien / W. Mieder. – Wiesbaden: Quelle & Meyer, 1997. – 356 s.

Mieder, W. Verdrehte Weisheiten: Antisprichwörter aus Literatur und Medien. Gesellschaft für Deutsche Sprache / W. Mieder. – Wiesbaden: Quelle & Meyer, 1998. – 396 s.

Mieder, W. Phrasen Verdreschen: Antiredensarten aus Literatur und Medien / W. Mieder. – Wiesbaden: Quelle & Meyer, 1999. – 399 s.